На развітанне…

**Летазлічэнне Алы Канапелькі**

На гэтай планеце нашы з ёй дарогі скрыжаваліся толькі двойчы: у далёкім 1981 годзе ў Каралішчавічах на семінары маладых пісьменнікаў Беларусі і 18 сакавіка 2003 года ў пераходзе мінскага метро. Так дакладна назвала гэту дату, таму што менавіта яна пазначана пад аўтографам Алы ў яе кніжачцы "Летазлічэнне". Мы не дамаўляліся сустрэцца, гэта была сапраўды выпадковая сустрэча, але, мусіць , зусім невыпадкова са мной была яе кніжачка вершаў. Кнігі мала якіх паэтаў я бяру з сабой у дарогу. Аліну вазіла доўга, перачытывала, цешылася яе літаратурным знаходкам, вобразам і перажывала разам з аўтарам яе боль страты… І хоць асноўны лейтматыў гэтай кніжачкі – сум, паміж радкамі жыве моцны характар аўтаркі. Тады верылася: яна ўсё пераадолее, перажыве, нягледзячы на душу такую чулую і далікатную.



Пазнаёміўшыся ў Каралішчавічах, мы, пачаткоўцы, пільна сачылі за творчасцю адзін аднаго. Нехта паспяхова ўзлятаў на беларускі Парнас, хтосьці не спяшаўся, сілкуючы сваю музу жыццёвым вопытам, працуючы над словам. Некаторыя наогул сышлі. Ала мне запомнілася прыгожай брунеткай з такімі незвычайнымі яснымі вачамі, якія, здаецца, не пасавалі да колеру валасоў. Ах! Хто мог ведаць тады, што ў яе прыгожых светлых вачах і знойдзе сабе прытулак страшная хвароба, якая і згубіла жанчыну раней часу. Яшчэ ў ёй спалучаліся дзве якасці: сур'ёзнасць і мяккі голас. У нашай, пераважна студэнцкай групоўцы, яна была ці не самая сур'ёзная і нейкая, як мне здавалася, празмерна мэтанакіраваная.

… Сёння, як абухом па галаве: ноччу памерла Ала Канапелька. Першай сумную вестку прыслала Тамара Бунта, якая была галоўным рэдактарам часопіса "Алеся", калі там працавала Ала. Не хачу сцвярджаць, а толькі выказваю сваю думку, што ці не дзякуючы ёй часопіс тады быў больш беларускамоўны, чым цяпер. А наогул, толькі ў гэты момант я раптам зразумела, што паспяхова пачаўшы сваю літаратурную дзейнасць, Ала Канапелька ў нейкі момант сышла,

што называецца нацянькі. Што яе выбіла з каляіны? Ці мо сама сышла, бо не мела ні купцюроў, ні клыкоў, а была сапраўдным паэтам з аголенымі нервамі і адкрытай душой…

Трымаю ў руках кніжачку “Летазлічэнне” з аўтографам простым і шчырым; бачу, як шмат гадоў таму Ала , прыхіліўшыся да пярэнчын перахода, піша і ўсміхаецца. Затым яшчэ раз просіць на хвіліначку сваю кніжку, адкрывае на толькі ёй вядомай старонцы і нешта там папраўляе. А я тады падумала: “Вось якая прыдзірлівая і дакладная, як у маладосці”. Сёння гартала старонкі і ніяк не магла знайсці тую праўку. А можа яна за гады знікла? А можа слёзы перашкаджаюць адшукаць яе? Затое з навязлівым пастаянствам адкрываецца дваццаць першая старонка з Развітальным вершам, прысвечаным Барысу Сачанку. Апошнія радкі там такія:

“…распляла вянок з рамонкаў, смолак,

не сказала, дзе шукаць ад сэрца зёлак.

Не сцямнелася, а развідняе…

Лёгкай смерці, верце, не бывае!

Цёплае, як Божае дыханне,

над зямлёю роднаю – світанне…”

Ала Канапелька не дажыла да світання…

Ала КЛЕМЯНОК.